Цана асобнага нумару 20 гр.

Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 5 Вільня, Нядзеля 9 Лютага 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл. на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адчэй шпальце

Праваслаўны Сабор з погляду нацыянальна-беларускага.

З стацьці „Сабор Праваслаўнай Царквы ў Польшчы“, зьмешчанай у папярэднім № 3 „Бел. Крыніцы*), нашы чытачы ўжо ведаюць, як мы адносімся да Сабору. Мы з вялікай радасьцю прывіталі вестку аб выбарах і шчыра жадалі, каб скарэй сабраўся гэты Сабор і каб на ім вырашыліся нарэшце ўсе царкоўныя пытаньні. Гэтыя нашы адносіны да выбару астаюцца нязьмененымі і цяпер, толькі ў гэты раз мы хочам сказаць некалькі слоў аб значэньні царкоўнага Сабору ўжо ня толькі з чыста царкоўнага, але-ж і з нацыянальнага пункту гледжаньня.

Гэта тым больш цяпер патрэбна, што ў астатнім нумары Луцкевічаўскай газэты „Наперад“ зьявілася адозва нейкага „Беларускага Царкоўнага Камітэту“(?) да беларускага праваслаўнага грамадзянства, у якой гэты нікому з беларусоў няведамы камітэт, пачаўшы з больш-менш праўдзіловых думак, робіць зусім неправідловыя вывады што да належных адносін праваслаўнага беларускага грамадзянства да выбараў на Сабор.

Кожны добры хрысьціянін добра ведае, што ў лоне хрысьціянскай царквы (ці касьцёла) павінны адпадаць і нацыянальныя, і клясавыя розьніцы. Там, як гаворыцца ў апостала Паўла, — „няма ні Элліна (грэка), ні Іудэя (жыда), ні раба, ні свабоднага, але ўсе і ўва ўсіх Хрыстос“. Але-ж мы ведаем і тое, што па-за царквой і касьцёлам у мірскім жыцьцю заўсёды ідзе гэтая клясовая і нацыянальная барацьба і кожная з борючыхся старон змагаецца за тое, каб скарыстаць у гэтай барацьбе між іншым і такую вялізарную сілу, якой зьяўляецца ў грамадзянскім жыцьці царква і рэлігія. Найясьней гэта выяўляецца тагды, калі царква, ці касьцёл цесна зьвязана з дзяржавай. Так, напрыклад, у часы царскага рэжыму ў Расеі, дзе царква была ў поўнай залежнасьці ад сьвецкай улады, заўсёды царкоўная іерархія і царкоўныя ўстановы ўжываліся як срэдствы падтрыманьня „самадзержавія“ і русыфікацыі. Так і цяпер пры помачы польскага грамадзянства, а яшчэ больш польскіх грамадзкіх арганізацыяў, полскі касьцёл ужываецца як срэдства полёнізацыі беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы. Полёнізацыя сільней за ўсё адбіваецца ў нас на духоўных сэмінарыях, дзе ўся навука выкладаецца папольску, а сьляды русыфікацыі ў тым, што выхаванае пад ўплывамі старых расейскіх традыцыяў праваслаўнае духавенства моцна трымаецца расейскай культуры і ня хоча пераходзіць у царкоўных казаньнях і ў царкоўна-адміністрацыйным жыцьці з расейскай на беларускую мову, ня гледзячы нават на тое, што гэтая мова даўно ўжо дазволена да ўжываньня і сьвецкай (польскай) уладай і ўладай царкоўнай (Маскоўскім Саборам 1917-18 г. і патрыярхам Ціханам).

Пакуль тое самае больш-менш гаворыць і „Царкоўны Камітэт“—бязумоўна ён мае рацыю. Мае рацыю і тады, калі наракае на нашы сучасныя царкоўныя кансісторскія парадкі і на афіцыяльна аб'ўленыя правілы выбараў на Сабор, у якіх яўна праглядывае страх вышэйшай іерархіі, каб не прайшлі на Сабор тыя з ніжэйшага духавенства і міран, якія ім не падабаюцца. Але вывад з усяго гэтага „Царкоўны Камітэт“ робіць зусім і не спадзяваны і не правідловы: выбары на сабор байкатаваць!(?)

Калі-б сапраўды мы паслухаліся гэткага заклiку таго-ж самазваннага Камітэту і сапраўды сталі-б байкатаваць сабор, гэта знача, што мы ніколі ня вышлі-б з зачараванага кола царкоўных непарадкаў. Хтож-бы тады нас ратаваў ад іх? Сам камітэт сьцьвярджае, што і царкоўна-адміністрацыйная ўлада, і ўся выбарная сыстэма знаходзіцца цяпер у руках гэтых-жа „епіскапаў, кансысторыяў, благачынных і іх служак“. Калі так дык хто-ж зьменіць гэтыя парадкі і хто мае права зьмяніць іх, калі не сабор? Ня зьбірацць сабор гэта і знача пазастацца на заўсёды ў гэтым бюракратычна - кансісторскім строю і нават адкінуць і самую надзею калі-небудзь зьмявіць гэтыя парадкі.

Вось дзеля чаго заўсёды ўсё царкоўнае грамадзянства беларускае і украінскае, і ў прэсе, і з соймовай, і з сэнацкай трыбуны, і на царкоўных зьездах, заўсёды змагалася і змагаецца за сабор. Няхай сабе першы сабор і зьбярэцца на не зусім выгадных і правідловых падставах, — усё-ж гэта будзе першым крокам да палепшаньня царкоўнай арганізацыі, калі можна так сказаць, — крокам да „дэмакратызацыі“ царквы. Вось зашто так ня хоча гэтага сабору ні царкоўная, ні сьвецкая ўлада і зашто шукае ўсялякіх прычын, каб не сабірацць, ці хоць адлажыць яго.

Хто ў газэтных вестках чытаў астатнія выясненьні міністэрства асьветы, з якіх прычын міністэрства не дазваляе сабору, той ня мог не заўважыць таго, што гэтыя выясненьні зроблены ледзьве ня ў тых самых словах, якімі піша і гэты самазванны камітэт. Адсюль і відаць, як гаворыцца, „дзе зарыты

*)На жаль у гэтай стацьці аказалася дужа няпрыемная друкарская амылка, зьмяняючая нават сэнс гэтага мейсца стацьці; у дзевятым радку з канца надрукавана буйным шрыфтам: н а р о д н ы м; трэба чытаць: н а р а д ч ы м.

Змагары за родную мову ў касьцеле.

Дня 24 І с. г. адбыўся суд у Вялейцы, выяздной сэсіі Віленскага Акружнога Суду, старшынёй якой быў судзьдзя Кадушкевіч. Гэты суд засудзіў сьпевакоў беларускіх рэлігійных песьняў у Жодзішным касьцеле,



Станіслаў Грыб



Міхал Ермак

Вялейскага пав. Станіслава Грыба на 9 месяцаў і Міхала Ермака на 4 месяцы вастрогу. Прычына віны вось такая. 10 чэрвеня 1929 г. у часе працэсіі са сьпевам рэлігійных песьняў пабеларуску і па польску здарылася непаразуменьне, віну якога сьведкі, у ліку якіх быў і кс. Дроніч, звалілі на Ст. Грыба і М. Ермака.

Ст. Грыб пасьля суду адразу пасаджаны ў Вялейскую турму, бо суд застасаваў арышт без замены на каўцію, ня гледзячы на тое, што Ст. Грыб чалавек ужо старэйшы, мае гаспадарку і сямью і ўцякаць нідзе ня зьбіраўся. М. Ермак застаўся на свабодзе за каўцію. Пры гэтым не адрэчы сказаць і тое, што судзьдзя пасьля прачытаньня прысуду заявіў, што засуджаныя пакараны не за сьпеў пабеларуску, а за авантуру, віноўнікамі якой, паводле доказаў сьведкаў — кс. Дроніча і іншых, былі быццам Ст. Грыб і М. Ермак. Прысуд гэты цяжкім рэхам адбіўся ў беларускім грамадзянстве. Уважаем, што гэта ёсьць ахвяры касьцельнай палітыкі кс. Дроніча. Але да гэтай справы мы яшчэ вернемся ў наступным нумары.

Засуджаныя Ст. Грыб і М. Ермак падалі апэляцыю.

сабака". Ясна, што гэты камітэт і стварыўся толькі дзеля таго, каб памагаць гэнай палітыцы гамаваньня саборнага жыцьця царквы. Але робіцца гэта так, каб беларускае грамадзянства не адразу магло зразумець запраўдны сэнс гэтай працы. Ня дарма сябры гэтага „Царкоўнага Камітэту" скрылі свае прозьвішчы пад агульнай назовай Камітэту, каб не паказаць, хто працуе ў гэтым Камітэце.

Прыймаючы гэта ўсё пад увагу, мы ўзноў шчыра і горача заклікаем праваслаўных не паддавацца на гэтую правакацыйную пробу „сарваць Сабор", а ісьці на выбары, выбіраць сваіх лепшых людзей і бараніць на Саборы свае і паркоўныя і нацыянальныя патрэбы, наскольні яны зьвязаны з жыцьцём царкоўным.

Праваслаўны Беларус.

АД БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ.

З прычыны зьмяшчэньня ў газэце «Наперад» адозвы «Да Беларускага Праваслаўнага Грамадзянства», заклікаючай да байкоту выбараў на праваслаўны Сабор і падпісанай: „Беларускім Царкоўным Камітэтам", гэтым падаецца да ведама беларускага праваслаўнага грамадзянства, што Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту, — арганізацыі, якая аб'ядновае сабой усе беларускія культурныя і палітычныя групы, якія стаяць на нацыянальным грунце, такая беларуская арганізацыя як „Б Ц. К." а таксама і склад яе — няведамы.

Старшыня Бел. Нап. К-ту
сэнатар В. Багдановіч

Сэкрэтар
Я. Пазьняк.

У № 4 с. г. „Б.-К." у аддзеле „Аб гаспадарцы" у 17 вершы знізу павінна быць „больш і лепш", а не „больш і менш."

Луцкевіч з кумпаніяй „працуе".

Кожнаму, хто сьлядзіў за беларускай палітыкай апошніх гадоў, асабліва за часоў „Грамады", была ясная дэфэнзыўная работа А. Луцкевіча. Ня іншую ролю гуляе Луцкевіч і сяньня.

Польскія паслы ў Сойме, асабліва з так званай „левіцы" (Недзялкоўскі), ня раз заяўлялі, што яны трапяць да нашага народу „над галовамі нашых паслоў і нашых арганізацыяў". Мэта такой палітыкі ясная — абысьці сапраўдных прадстаўнікоў народу, памінуць так-жа сапраўдныя беларускія арганізацыі і ўзяць безбаронны народ у свае рукі. Гэтую работу робіць сяньня паляком Луцкевіч. Луцкевічаўскі „Наперад" у нумары 4, 1929 г. у стацьці „З Новым Годам" піша, што беларускія паслы, беларускія ўстановы — гэта „*адно тольні фірмы, тольні вывескі*". З боку Луцкевіча гэта ёсьць заклік да ураду не рахавацца з беларускімі пасламі і з беларускімі ўстановамі, гэта ёсьць заклік да народу старанімца сваіх паслоў, сваіх арганізацыяў, гэта ёсьць разбурэньне тых нямногіх асяродкаў беларускага народнага жыцьця, якія з такімі вялікімі трудамі здабыты.

У нумары 3, 1930 г. „Наперэду" спатыкаем лепшыя краскі Луцкевічаўска-дэфэнзыўнай працы. У зацемцы „Кола замыкаецца" Луцкевіч піша, што комуністычная партыя вядзе паход проціў беларускіх сярэдніх школ пад Польшчай і што... „Хадэцыя — з поўнай сьведамасьцяй таго, што робе, пашырае сярод грамадзянства ўсю тую ілжу компартыі, якая фабрыкуецца апошняй з мэтай „узрываньня" нашых гімназіяў". З гэтых Луцкевічаўскіх слоў выходзе, што Хадэцыя працуе ў контакце з комуністамі. Гэтак аб нас піша „Dziennik Wilenski", гэтак нас хрысьце ведамы жандар у сутане ў Жодзішках кс. Дроніч, гэтак і Луцкевічаўскі „Наперад". Тут трудна дзівіцца, а тымбольш абурацца — Луцкевіч сваю ролю спаўняе. Але для ведама грамадзянства падаём колькі слоў выясьненьня справы гэнага „ўзрыву". Справа ў тым, што ў леташнім школьным годзе з Віленскай Беларускай Гімназіі было многа выдалена вучняў за палітычныя выступленьні. Тое-ж самае, за падобныя недапушчальныя ў школе выступленьні спаткала некульні вучняў сёлета. Луцкевіч віну за гэта складае на агітацыю сваіх нядаўных палітычных прыяцеляў, якіх ён заве комуністамі, а так-жа і на хадэцыю. Вось-жа ў імя праўды сьцьвярджаем наступнае. Калі Луцкевіч іграў першую скрыпку ў грамадаўскіх газэтах, калі арудаваў там, калі гімназія была ў руках грамады — была яна грамадаўскай палітычнай экспозытурай у поўным значэньні гэтага слова. Луцкевіч у прэсе, а цяперашнія прыяцелі яго ў гімназіі, гэты палітычны грамадаўскі дух стварылі, падтрымлівалі, пахвалялі. Калі-ж „Грамада" была разгромлена, Луцкевіч, астаўшыся на свабодзе, стаў на чале польска-беларускай санацыі і зьявіўся ў гімназію „пэдагогам".

Моладзь, верная свайму раней прысвоенаму настрою, Луцкевіча і блізкіх да яго абазвала здраднікамі і пачала бурлівыя і варожыя пад іх адрасам дэмонстрацыі. У выніку ўсяго гэтага некульні дзесяткаў нашай моладзі са зламанай душой, недавучкамі апынуліся на вуліцы. Пытаемся, хто тут вінават? Ясны адказ — уся адказнасьць за гэтую трагедыю моладзі беларускай віленскай гімназіі ўсім сваім цяжарам падае на тых, хто прыступнаю рукой першы пасеяў зярняты гнільля і развалу ў душах нашай моладзі, а пальля, на супроць ня то пэдагогікі, але звычайнай прызваітасьці, прышоў лячыць тую ж моладзь. **Z.**

З газэт.

Вялікарусы-маскалі страцілі ўжо ўплывы на Украіне і Беларусі.

Расейскія газэты падаюць, што „Расейскае Народнае Аб'яднаньне" (Р.Н.О.) у мяйсцох, дзе адбыліся выбары дэлегатаў на Сабор Праваслаўнай Царквы — папярпела поўны правал. На Украіне прашлі ў вялізарнай большасьці украінцы, а на Беларусі — беларусы.

Дык чаго-ж баіцца і што думае бараніць нейкі царкоўны камітэт у Вільні, які зьмяшчае сваю адозву ў Луцкевічаўскім „Наперадзе"? Ці не скіраваная гэтая адозва „Царкоўнага Камітэту" да беларусаў проціў беларусаў?!

Крук не паддаўся.

„Dziennik Wilenski" (30.I. с. г.) падае, што „акружны ўрад П.П.С. ляв цы зьвярнуўся да раднага (м.Вільні — рэд.) Кузьмы Крука, каб ён адрокся мандату і выступіў з ліку гарадзкой Рады, дзеля таго, што прылучыўся да беларускай санацыі (Астроўскі-Луцкевіч) і працуе проціў пролетар'яту, каторага галасамі атрымаў мандат раднага". Але, як даведываемся, Крук не паддаўся.

Колектывізацыя Савецкае Беларусі.

I.

Апошнім часам саветы пачалі праводзіць агульную колектывізацыю па ўсім С.С.Р Р. Гэтыя спробы не абмінулі й Усходняй Беларусі, што пад саветамі.

Што такое колектывізацыя? Колектывізацыя — гэта будзе такі спосаб гаспадаркі, дзе людзі працуюць не для сябе, а для цэлай грамады-колектыву. Пры колектывізацыі злучаюць у адно ўсе паасобныя сялянскія гаспадаркі з усім, што ў іх ёсьць гэта значыць: зямлю, будынкі, жывёлу, малатарні, плугі, нават бароны і іншыя гаспадарскія прылады і такім чынам твораць адну агульную вялікую гаспадарку, якбы двор, дзе парадак вядзе назначаны савецкай уладай камісар-аканом. Вось-жа гэты камісар пільнуе, каб у пару выхадзілі на работу, каб пільна працавалі, ён раздзяляе паміж усімі сябрамі колектыву працу, аднаму гарадь, другому баранавадь, трэцяму працавадь у кузьні, сталярні і г. д. Такім чынам колектыў, або як яго завуць у саветах калхаз (калектыўнае хазяйства), ці калгас (калект. гаспадарка) сусім падобны да даўнейшага вялікага двара, дзе аканом раздзяляў паміж парабкамі працу і выдаваў андынарыю.

Людзі ў такім калгасе жывуць або ў сваіх хатах, якія ім пакідаюцца на тымчасовае карыстаньне, або ў агульных бараках. Там маюць яны супольную кухню, супольны стол і карыстаюцца з выдзеленых акономам порцыяў. Савецкія ўлады ідуць да таго, каб усіх сяброў колектыву зраўняць ня толькі ў працы, ежы і адзежы, але і кватэры і затым, дзе толькі можна, з вясковых хат робяць супольныя баракі, дзе кожная сям'я мае для сябе вызначаны куток і дзе можа прытуліцца...

Вось які парадак пануе ў калектывах і якое ў іх устройства.

А цяпер пытаньне — чаму камуністы кінуліся на такія рызыкоўныя спробы і што іх прымусіла гнаць людзей у калектывы?

Прадусім іхная праграма. Паводле комуністычнай праграмы прыватная ўласнасьць не дапускаецца, яе трэба зносіць і на месца прыватнай уласнасьці заводзіць супольную, грамадзкую ўласнасьць, гэта знача комуны або, як цяпер называюць, колектывы. Праз дзесяць гадоў комуністы ня ўводзілі сваей праграмы ў жыцьцё, яны ўмацовывалі сваю ўладу, душылі сваіх ворагаў, а калі пачуліся моцнымі, дык пачалі праводзіць сваю праграму. Заграніцай часта з іх сьмяяліся, казалі „якія-ж вы комуністыя, калі ў вас комуны няма"? — дык каб апраўдаць сваю праграму, комуністы пачалі заводзіць колектывы.

Спачатку яны рабілі гэта бяз гвалту, заахвочвалі толькі, давалі дапамогу грашмі, жывёлай, дрывам, гаспадарскімі прыладамі, але калі паглядзелі, што сяляне не кваліцца, пачалі гнаць у колектывы сілаю.

Дык сама комуністычная праграма была першай і галоўнай прычынай цяперашняй зямельнай палітыкі ў саветах. Але была яшчэ другая прычына прымусовага заводжаньня колектыўных гаспадарак — гэта цяжкое эканамічнае палажэньне ў саветах.

Кожны ведае, як трудна цяпер жыць у савецкіх рэспубліках. Няма хлеба, мяса, малака, розныя продукты па гарадох выдаюць па картачках; каб дастаць па картачцы, трэба цэлымі днямі стаяць у калейцы, а калі і ўдасца нешта атрымаць па картачцы, то гэтае „нешта" выглядае вельмі скупа, так як на раз укусіць. Цярпелі на гэтым прадгарады, бо на вёсцы селянін пры сваей працы і на сваей гаспадарцы сяк-так пражываў. Комуністы стараліся адбіраць ад селяніна яго лепшую „порцыю", пасылалі нават цэлыя аддзелы войска і міліцыі, каб адбіраць ад селяніна яго запасы, селянін не хацеў дарма аддаваць і хаваў свае дабро, тады камуністы трасьлі ўсю гаспадарку і калі знаходзілі, каралі таго селяніна, як „кулака;" „контрэволюцыянера," які не спагадае савецкай уладзе. У адказ на гэтакія гвалты, сяляне перасталі засяваць усё поле, а сеялі толькі, скольні трэба было самым на пражыцьцё. Рэзультат быў такі, што па гарадох пачаўся яшчэ большы голад. Для камуністаў ня было іншага выхаду, як заводзіць колектывы.

Пры колектывах яны могуць ня толькі прымусіць селяніна да працы, але што найважнейшае — могуць скантраляваць ураджай і з колектыўнага сьвірна выдзяліць часьць сялянам, якія працуюць у колективе, а часьць завясьці ў горад. Вось якім парадкам комуністы задумалі памагчы бя-

З Беларускага жыцьця.

З БЕЛАРУСІ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Паседжаньне Цэнтральнага Ураду Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Дня 28 студзеня с. г. адбылося паседжаньне Цэнтр. Ураду Бел. Інст. Гасп. і Культ., на якім разглядалася справа цяжкога палажэньня прыватнай беларускай школы ў Шаўлянах, Браслаўскага пав., якая ўтрымоўваецца Бел. Інст. Г. і К. У гэтай справе прынята адпаведная пастанова. Пры гэтым абгаварываліся і іншыя справы, належачыя да кампэтэнцыі Б. І. Г. і К.

Суды над Беларусамі. На дзень 17 сакавіка с. г. вызначана судовая расправа ў Віленскім Акружным Судзе рэдактара нашай газэты Я. Пазьняка, абвінавачанага па 132 арт. К. К., а на дзень 26 лютага інструктара Бел. Інстытуту Г. і К. В. Шутовіча, засуджанага ў першай судовай інстанцыі на два месяцы арышту.

Беларуская народная прасьвета пад кіраўніцтвам польскіх школьных інспэктараў. Паводле афіцыяльнага дакуманту Віленскай школьнай куратарыі, на абшарах 3-х беларускіх ваяводзтваў знаходзіцца цяпер беларускіх народных школ толькі: 23 школы чыста беларускія (дзяржаўныя) і 41 двумоўных (утраквістычных).

Рост дзяржаўнага беларускага народнага школьніцтва ў вокрузе Віленскай Школьнай Куратарыі выглядае вось так: у параўнаньні мінулага школьнага году з сёлетнім, дык лік чыста беларускіх школ павялічыўся на 2 школы, бо адна з іх зьліквідаваная, а 3 аткрыты. Двумоўных (утраквістычных) — лік зьменшыўся на 2 школы, бо 9 з іх зьліквідаваны, а атрыта 7.

Калі-б залічыць і ўтраквістычныя школы да беларускай народнай прасьветы, дык гэная статыстыка паказвае, што беларуская народная прасьвета на кошт дзяржаўны не павялічылася сёлета ані на адну школу. Убогі лік беларускіх школ 23 і 41 утраквістычная ўсё той самы.

„Шлях Моладзі" і „Будучыня". Беларуская моладзь, згуртаваная каля часопісі для беларускай моладзі „Шлях Моладзі", яшчэ з восені мінулага году пастанавіла залажыць арганізацыю для беларускай моладзі пад назовам „Будучыня". Арганізатары „Будучыні" апрацавалі для арганізацыі статут, падалі да ўладаў на зацьверджаньне. Але гэты статут штосьці заляжаўся ў паперах дзяржаўных уладаў і аб лёсе „Будучыні" яшчэ ўсё ня чуваць. Закладчыкі „Будучыні", ня маючы фармальнай арганізацыі для беларускай моладзі, выдаючы сваю часопісь „Шлях Моладзі", якая выходзіць рэгулярна што месяц, сваю думку праводзяць у жыцьцё, хоць і ня ў ва ўсёй яе поўнасьці, лучачыся з шырокай масай беларускай моладзі Заходняй Беларусі, а нават і заграніцай, праз сваю часопісь „Шлях Моладзі".

Новая беларуская студэнская арганізацыя. Сярод беларускай студэнскай моладзі ў Вільні залажылася новая арганізацыя „Саюз Студэнтаў Народнікаў імені Ф. Багушэвіча". Гэная арганізацыя мае на мэце навязываньня цясьнейшай лучнасьці з беларускай люднасьцяй.

Калі з добрым намярэньнем, дык асталецца толькі прывітаць. Але пажывём — пабаем.

Рэвізія ў беларускай кнігарні Т-ва „Рунь". У нядаўна адкрытай у Вільні кнігарні Т-ва „Рунь" прадстаўнік Віленскага Гарадзкога Старосства зрабіў рэвізію, дзе знайшоў беларускія кніжкі выданыя ў Менску.

Праваслаўныя беларусы прадстаўнікоў на Сабор выбіраюць беларусаў. На прыходзкіх выбарах між іншымі выбраны і вялямыя беларускія дзеячы: сэнатар Рагуля і быўшы дырэктар Віл. Беларускай Гімназіі Паўловіч. Сэнатар Рагуля выбраны ў Наваградчыне, а б. дырэктар гімназіі Паўловіч на прыходзкім сабраньні Прачысьценскага Сабору ў Вільні.

Беларускі спэктакль на вёсцы. Данюшаўскі гуртох Бел. Інст. Гаспад. і Культуры ў нядзелю 26.І. с. г. ладзіў у в. Казянятах, Жодзішчанай гміны спэктакль-вечарыну. Адыграна „Птушка Шчасьця". Народу было шмат.

— 19.І. с. г. Крыніцкі гурток Бел. Інст. Гаспад. і Культуры ў м. Дубровe Маладэчанскага пав. ладзіў спэктакль-вечарыну. Адыграны „Міхалка" і „Лекары і лекі". Вялікая саля была запоўнена людзьмі.

Канцэрт у Віл. Бел. Гімназіі. 2 г. м. у Віл. Бел. Гімназіі быў ладжаны беларускі канцэрт, у часе якога выступалі гімназіяльны хор, духавая і струнная аркестры і салісты. Пасьля былі скокі.

БЕЛАРУСЫ ПАД ЛАТВІЯЙ.

Беларускі зьезд у Дзьвінску. Як даведваемся, 26.І. с. г. у Дзьвінску адбыўся беларускі зьезд 172 дэлегатаў з Дзьвінскага і Люцынскага пав., а так-жа і з Рыгі. Старшынёй зьезду быў пасол латвійскага Сойму грам. Пігулеўскі.

„Наша Доля". Пад такім назовам пачала выходзіць у Дзьвінску беларуская газэта, дэмакратычнага народнага кірунку. Вітаючы гэту газэту, жадаем ёй добрых пладоў для беларускай справы.

Беларусы ў Амэрыцы памятуюць аб сіротах у Заходняй Беларусі. Наш карэспандэнт паведамляе, што Амэрыканскі Беларускі Нацыянальны Камітэт ў Чыкаго 16 г. м. ладзіць беларускі канцэрт, даход з якога ахвяраваны для сірот Заходняй Беларусі.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

З колектывізацыяй ня так проста. Як беларускія сяляне ў Рад. Беларусі адносяцца да праводжаньня г. зв. агульнай колектывізацыі, хай сьведчаць наступныя факты, узятыя не з якіхнебудзь няпэўных крыніц, а з самой менскай „Зьвязды". У вёсцы Ляхаўшчына, Чавускага раёну селянін стрэліў праз вакно ў агранома, што праводзіў колектывізацыю і заганяў усіх у калгасы. Гэтае самае здарылася у в. Сколява, таго-ж раёну, дзе прастрэлілі чырвонага партызана, Кондалева, „арганізатара" калгасаў. У в. Дунаева, каля Магілева, сяляне напалі на актыўніка калгасу і зарэзалі яго нажамі. У в. Гдыні, Камароўскай раён сяляне забілі таксама актыўніка калгасу, Раманава.

Іноў у Ветрыне, Цыракоўскага раёну, сямёх гаспадароў пашло ў сельсавет з крыкам — „Давайце нам тых, хто рабіў раскладку збожжа". Не знашоўшы нікога ў Сельсавеце, яны скіраваліся да найбольшага мясцовага актыўніка Сабалева і так пабілі яго і яго сям'ю кулакамі, што тых адвязьлі ў бальніцу.

Гэта ня ўсё. Гэткіх і падобных здарэньняў, цэлая куча — ды няма месца, каб іх усіх апісаць.

Менск без званоў. У Менску адабраны ўсе званы, як царкоўныя, так і касьцельныя і пазабіраны на патрэбы промыслу. Таксама пастаноўлена адабраць царкву чыгуншчыкаў і Залатагорскі касьцёл. Будынкі касьцёлу і царквы пойдуць пад комуністычныя клюбы.

Жылуновіч „пакаяўся". З. Жылуновіч, проці якога бальшавікі былі павёўшы вострую кампанію, цяпер напісаў заяву ў Цэнтральны ўрад компартыі, у каторай прызнае свае памылкі і абяцае „паправіцца".

Тыя, што знаюць стыль пісаньня Жылуновіча, цьверцязь, што гэта заява ня ім пісаная. Гэта можа быць праўдай, бо ў гэтай заяве ёсьць напр. такія красачкі „усялякія клерыкалы з пад знаку Янкі Станкевіча(?!)" і г. п. Трудна паверыць, каб З. Жылуновіч мог дапусьціць гэткія бязграматнасьці аб адносінах у Зах. Беларусі. Скарэй, што яго пазвалі у Г. П. У. і прыказалі падпісаць наперад прыгатаваную дэкларацыю.

З заграніцы.

Справядлівы крок латвійскага ўраду. У Латвіі 11 г. м. пачынаецца агульная перапісь насельніцтва. Для гэтай перапісі выдана адпаведная і вельмі разумная інструкцыя. У гэтай інструкцыі сказана, што ў Латвіі спатыкаюцца найбольш такія нацыянальнасьці: латышы, немцы, вялікарусы жыды, палякі, беларусы, літоўцы і эстонцы. Дзеля гэтага нікога ня можна запісываць „рускім", а трэба запісываць — вялікарус, беларус.

Гэты крок латвійскага дэмакратычнага ўраду сапраўды ўкарачае апэтыт шовінізму сільнейшай культурна нацыі ў адносінах да слабейшай. Паводле гэтай інструкцыі, вялікарусы ня так лёгка змогуць залічыць у свой лік нясьведамых праваслаўных беларусаў, якія праваслаўную веру называюць „рускай," а дзеля гэтага сябе „рускімі."

Можа гэты крок латвійскіх палітыкаў падасьць ахвоты паступаць падобна палітыкам польскім у адносінах да беларусаў каталікоў, якія каталіцкую веру называюць „польскай", а дзеля гэтага сябе „польскімі".

Бальшавікі падрабляюць грошы. У Бэрліне на судзе над фальшыўнікамі бальшавіцкіх чырвонцоў выявілася, што бальшавікі вельмі многа падрабілі даляраў, якія высылалі за граніцу на агітацыю бяз ліку, а важачы на тонны (тонна 61 пуд.) Падробленых — фальшывых даляраў комуністы выслалі хінскаму ген. Фэнгу аж 2 тонны. Падробленыя ангельскія фунты, амэрыканскія і мэксыканскія даляры высланы на агітацыю ў Сырыю, Сіам, Індыю і Палестыну.

Словам, розных заграничных гропай падроблена шмат, з прычыны якой цяпер банкі вельмі асьцярожна прыймаюць даляры і фунты.

дзе. Ці памогуць — гэта другая справа, але пробы ідуць па ўсім С.С.Р.Р. Ужо сколектывізавалі каля 36 мільёнаў гэктараў зямлі. Касуюць адзельныя гаспадаркі, хутары, сялянскія надзелы і гоняць усіх у колектывы. Гоняць і багатых і бедных—і тых што маюць па адной карове, і тых, што маюць па тры, і тых, што ня маюць ніводнай. Гоняць на адных правох — нікому нічога ня плацячы. Рэч зразумелая, што багацейшыя сяляне, якія маюць па тры каровы, ня хочуць аддаваць свайго быдла на раўне з іншымі, якія маюць па адной, дык „лішку" рэжуць на мяса, а коней забіваюць, дзяруць скуру і вырабляюць сабе на боты. Кажуць—у колектыве можа ботаў не дадуць... Да таго дайшло, што пачалі разьбіраць і паліць будынкі: хлявы, гумны, сьвірны, кажуць—усё адно нам не патрэбны будуць, а цяпер хоць пагрэцца добра пры сваіх драв ах... Вось якія рэчы дзеюцца ў савецках. Комуністы за гэта пачалі моцна караць, як за сабатаж (падрываньне) савецкай улады і так, за зарэзаньне каровы даюць па 5 або нават і 10 гадоў катаргі! Але і гэта мала памагае, сяляне, як пішуць тамашнія газэты, рэжуць кароў, авечкі, колюць сьвіньні, б'юць каней—словам, пайшоў вялікі пагром на ўсю жывёлу. Хочуць зраўняцца з беднякамі—калі роўнасьць, то роўнасьць...

Такім парадкам у савеѓах палажэньне ня толькі не папраўляецца, але яшчэ горшае, кажуць, што там на лета шмат поля астанецца не засеянага, а калі і будзе засеяна, то бяз гною ўраджай будзе вельмі слабы. Сапраўды, комуністы сваей палітыкай могуць прывесьці ўвесь край да вялікага голаду, якога ня было нават на пачатку іхняга панаваньня ў 1919—1921 гадох. Шкада народу!

Але ці толькі праводжаньне свае праграмы і кантраляваньне ўраджаю маюць намэце комуністы, уводзячы колектыўныя гаспадаркі? Можа яны маюць яшчэ іншыя мэты, ідучы на такія рызыкоўныя спробы?

Так, маюць, але аб гэтым другім разам.

Концэрт-Баль.

БЕЛАРУСКАГА, ЛІТОЎСКАГА І УКРАІНСКАГА СТУДЭНСКІХ САЮЗАЎ

адбудзецца 9 лютага с. г. ў салі Прамысл. Гандл. Клюбу — Міцкевіча 33/А.

Будуць выступаць: проф. Галкоўскі, Ёдко і інш., а так-жа і хор пад кіраўніцтвам пана Матвійца. Пачатак канцэрту а гадзіне 21, пачатак балю а 23 гадзіне.

Як бальшавікі ліквідуюць прыватную ўласнасьць у С.С.Р.Р.? Дзеля ліквідацыі сялянскіх гаспадарак і загнаньняў ў комуну, бальшавікі арганізуюць асобныя атрады „актывістаў,“ якія робяць налёты на вёскі і ліквідуюць сялянскія гаспадаркі. А гэта робіцца вось так. „Актывісты“ прыяжджаюць у вёску, заходзяць у хату гаспадара і аб‘яўляюць сябе ўступіўшымі ў колектыў тае вёскі; па заяўленьні гэтага апісываюць ўсю маемасьць, адбіраюць яе ад сялян і закладаюць колектыў. Добрая ласка „актывістаў“— дык прымуць гаспадарага ў колектыў, а то кажуць ідзі, куды хочыш — прылучайся да „актывістаў“ і рабі так як і яны зрабілі—адбірай ад другіх сялян гаспадаркі і закладай калектывы. Сяляне praціваяцца гэтаму і заяўляюць, што будуць паліць колектывы.

З Вільні і Віленшчыны.

Арышты. Газэты польскія падаюць, што „Бел. Сял. Раб. Клюб“ у апошнія часы выдаў аж 26 брашур, якія ўладамі сканфіскаваныя. Паліцыя ловячы гэтую літэратуру праводзіла ў падазроных асоб рэвізыю ў Вільні і Віленскім ваяводстве. У выніку гэтага лаўленьня нелегальных друкаў і рэвізыі, у Вільні арыштавалі каля дзесятка асоб і многа на правінцыі. Як даведаваемся, ахвярамі гэтай працы палі і некатарыя асобы ня маючыя з ёй нічога супольнага.

Аб гаспадарцы.

Варта і аб гэтым падумаць.

Сапраўды трудна сабе вытлумачыць, як гэта можа быць, што Беларус наш з натуры сваей так добры, так адзыўчывы на ўсякія патрэбы ня толькі чалавечыя, але і гадаванае сабой жывёлы, гэту апошню часта вельмі мучыць. Маю тут на ўвеце запрэжаных коняў, цягнучых з-г а р ы вазы часта досыць цяжкія і вялікія. Бедная жывёла выбіваецца проста з сіл, каб вытрымаць на плячах напіраючы з-заду воз, а траціць гэтыя сілы проста на дарма. Бо і што-ж прасьцейшае, як гэту надсільную працу жывёлы замяніць найпрасьцейшым хоцьбы т о р м а з а м пры калёсах, а сілу жывёлы выкарыстаць на працу патрэбную? Найвышэйшая пара, каб такія тормазы былі ў гаспадарцы сапраўды зроблены, асабліва ў тых мясцох, дзе поле гарыстае.

* * *

Жывем у пару, калі ўсё робіцца пад меру, пад рахунак, пад вагу. У дробнай сялянскай гаспадарцы ня ўсё гэта магчыма, але што магчыма, тое трэба зрабіць безадкладна. І чаму напр. наш селянін да гэтай пары ня ведае нават, які абшар займае кожны кусок ягонага поля, ці сенажаці? Асабліва-ж сягоньня, калі ўсякія даныя аб колькасьці пасеўнага зярняці, угнаеньня, ураджаю, а нават і неадступных падаткаў стасуюцца заўсяды да пэўнай меры. А гэта-ж так лёгка зрабіць: у пару, калі поле агульна дaступнае, зьмерыць яго ўдоўжкі і ўпоперак прынамся крокамі, сьцьвердзіўшы прад тым даўжыню сваіх крокаў (нармальна робіць чалавек 120 крокаў на 100 мэтраў) і атрыманыя цыфры перамножыць. 10.000m^2 (100$\times$100) даюць адзін гэктар, 100m^2 (10$\times$10) даюць адзін ар. У гэктары ёсьць 100 араў.

* * *

Прыпомніць трэба гаспадыням сваім, што куры выседжаныя ў сакавіку м-цы („марцоўкы“) бываюць найбольш нясушчымі. Са збажжавін для курэй найлепшым ёсьць авёс.

* * *

У першых днёх сакавіка (марца) трэба фруктовыя дрэвы пабяліць вапнай. Асабліва з паўдзённага боку. Нявыкананьне гэтага мае тыя насьледзтвы, што кара на дрэве лопаецца, а ў шчэлінах гэтак паўстаўшых загнезьдзяцца ўлетку ўсякія шкоднікі дрэў. Старое лісьцё трэба зімой з дрэваў да чыста пастрасаць, бо там шкоднікі таксама зімуюць і далей размнажаюцца. Ськіненае старое лісьцё нельга нікуды кідаць, нават на сьмяцьцё, а трэба старанна й дачыста спаліць.

(З працаў інж. Ад. Клімовіча).

Да нас пішуць.

МОЛАДЗЬ, АПАМЯТАЙСЯ.

м. Астрына, Шчучынскага пав. Аб нашым мястэчку мала што чуваць у беларускай газэце. Выглядае, што ў нас не беларусы жывуць, а які іншы народ. Тымчасам у нас такія-ж самыя беларусы, як і ў іншых мяйсцовасьцях нашага павету. Або можа хто думае, што ў нас усё добра? Ой не! Моладзь распусная. Да добрага не прывучаецца, а расьце, як кажуць, на лес гледзячы. Замест каб чытаць кніжкі або газэты — ходзіць вечарамі па вуліцы і крычыць. Наша моладзь прывыкае добра і да гарэлкі, п‘е як ваду. Ад большых бяруць прыклад і меншыя, патрапляючы таксама. Гэтых усіх згубных навыкаў нашай моладзі пералічыць тут трудна. А прычына гэтаму ўсяму — кепскае выхаваньне, цемната.

Дарагая моладзь старэйшая, — ратуй сябе ад загубы! Кінь гарэлку, дурныя навыкі, а выпішы сабе сваю родную беларускую газэту „Б. Крыніцу,“ або часопісь беларускай моладзі „Шлях Моладзі,“ зарганізуй культурна прасьветны гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры і працуй над сабой дзеля ўласнага дабра. З газэт даведаешся, як трэба працаваць над сабой, каб паправіць свой лёс, а свая беларуская арганізацыя прывучыць да працы арганізаванай.

А. Рачынскі.

ШТО БУДЗЕ ДАЛЕЙ?

в. Бурачкі, Нясьвіскага пав. Пытаньне, што будзе далей, зьяўляецца ў кожна беларуса, глянаўшы на падрастаючых дзяцей. На гэтае пытаньне ўзгадавальнікі беларускага новага пакаленьня — польскія вучыцялі адказаць ня могуць. Ды й што ёсьць супольнае між польскім вучыцелем і беларускімі дзяцьмі? Проста анічога! Польскі вучыцель з беларускімі дзяцьмі мае толькі тую сувязь, што яны між сабою спатыкаюцца ў польскай школе, куды беларускія дзеці пасылаюцца бацькамі, каб не плаціць кары, дзе вучыцель „працуе“ за кавалак хлеба і для хлеба. Вот і ўся сувязь беларускіх дзяцей з народнымі прасьвяціцелямі—польскімі вучыцялямі ў нашай старонцы. Глыбейшай сувязі між нашымі дзяцьмі і польскімі вучыцялямі няма ніякай! Вучыцель у школе адбывае „павіннасьць“ сваю, а дзеці сваю. Пасьля гэтай „павіннасьці,“ як вучыцель, так і дзеці „вольныя казакі.“ Вучыцель жыве сваім жыцьцём, а беларускія дзеці сваім.

Навука ў польскай школе нашых дзяцей ня цікавіць, бо яна праводзіцца ў незразумелай для беларускіх дзяцей польскай мове. Сядзіць нашае дзіця ў польскай школе гады 3 4 над польскім лементаром, а прыдзецца, дык і літэраў ня знаюць. Такая навука анічога не дае, а толькі марнуе час— маладыя гады дзяцей. І так дзеці нашыя растуць на лес гледзячы без належнай навукі і ўзгадаваньня. І каму з гэтага карысьць? Хіба анікому! А нам беларусам шкода. Але што будзе далей? Аб гэтым дык і думаць страшна. М у ж ы ч о к.

БЕЛАРУСЫ КАТАЛІКІ З ПРАВАСЛАЎНЫМІ НЯ СВАРАЦЦА.

Трабы, Валожынскага пав. У нас жывуць беларусы праваслаўныя і каталікі. Людзі нашыя веруючыя: праваслаўныя любяць хадзіць у царкву, а каталікі ў касьцёл Бывае, што па кампаніі каталікі заходзяць у царкву, а праваслаўныя ў касьцёл.

Ксяндзом польскім гэта не падабаецца, але людзі нашыя махнуўшы рукой кажуць— няхай гаворыць, што хоча, а мы сваё. Заблудзіла адзін раз у нашу ваколіцу нейкая беларуская газэта „Наперад“ і прынесла яна нам поўны кошык махлярства. У той газэце напісана, што Б. Х. Д. і „Бел. Крыніца“ робіць паход на праваслаўных, але-ж у нас вельмі шмат хто чытае „Бел. Крыніцу“ і ніхто нідзе не спасьцярог гэтага паходу. Вот налгаў гэты „Наперад“, дык налгаў! Нашы людзі знаюць ня толькі „Бел. Крыніцу“, але добра знаюць яе рэдактара і рэдактара бацькоў—людзі як людзі, такія самыя, як і нашыя, усе сяляне беларусы, а „Наперад“ раптам кажа, што яны робяць паход на праваслаўных. Мусіць рэдактар „Нападу“ сусім ня знае беларусаў вяскоўцаў, бо каб знаў, дык пэўнеж так ня пісаўбы—ня страшыўбы дзіця дзедам.

Нашыя людзі спакойныя, ніякай дзейнасьці не праяўляюць, але беларусы яны моцныя і на абман не паддаюцца. Сьв.

МАТЭР‘ЯЛЬНЫ НЕДАХВАТАК І ЦЕМНАТА РОДЗІЦЬ МАРАЛЬНЫ УПАДАК.

Юрацішкі, Валожынскага пав. Хіба ў галодныя 1918-19 гады была такая бяда сярод нашага сялянства, якая пануе цяпер. Заработкаў нідзе ніякіх, а калі й ёсьць, дык такія-ж марныя, што чалавек з канём за дзень заробіць два з паловай злотых. Разходы вялікія, на ўсё трэба, асабліва на падаткі, а прадаць няма чаго, ды й тое ўсё за бязцэн ідзе. Стварылася такое палажэньне, што хоць ты воўк траву еш, як кажуць людзі.

Найгорш эмагацца з гэтай бядой людзям цёмным. Яны, шукаючы выхаду і ратунку, пачынаюць красьці, а ад зладзейства недалёка і да забойства. Нядаўна ў нашых ваколіцах было такое здарэньне, што адзін селянін у суседняй вёсцы ўкраў парсюка, а нехта забіў лясного купца. Нешта страшнае. Дзе выхад і дзе ратунак ад гэтага?

Дарагія браты, ад гэтай небяспекі трэба ратавацца. А ратунак у прасьвеце. Трэба нам прасьвячацца: чытаць газэты, лучыцца ў свае арганізацыі і змагацца са злом. Маральны ўпадак-зло згубіць нас да рэшты, а прасьвета вывядзе з галіты матэр'яльнай і маральнага ўпадку на лепшы і сьвятлейшы жыцьцёвы шлях. М. А.

НІ НА ЎСХОД, НІ НА ЗАХАД, А САМІ НА СЯБЕ МУСІМ АР ЕНТАВАЦЦА.

Сакольскі пав. Цяжкое палажэньне матэр‘яльнае зварочвае вочы на ўсход, думаючы, што ўсход зможа гэтую бяду направіць, а цяжкое палажэньне духовае, якое пануе на ўсходзе змушае сялян замкнуць пагляды на ўсход і шукаць выхаду тут на мейсцы. Пры гэтым, разгледзіўшыся ў усходніх парадках, у справах матэр‘яльных даецца прыкмеціць нават загубу для сялянства як самастойнай сялянскай гаспадаркі. Там з вольнага селяніна хочуць зрабіць парабка — нявольніка і загнаць яго ў комуністычны прыгон. А прыгон — ведама чым пахне. Захад так-жа даў сябе пазнаць.

Нашы праваслаўныя беларусы з болем у сэрцы спаткалі вестку аб перадачы ў суд больш 500 цэркваў, каб яны былі ўласнасьцяй не праваслаўнай царквы, а каталіцкага касьцёла. Гэта вестка нашых праваслаўных беларусаў мацней загартавала ў сваей веры, якія кажуць, што калі б нават асталіся і без царквы — ўсёроўна праваслаўнай веры ня зьменім. Чутны і такія словы — мы ня рускія, а беларусы, нам ня трэба думаць ані аб усходніх ані аб заходніх парадках, нам трэба думаць на сам перш самым аб сабе. Так і на мой пагляд здаецца, што мы павінны думаць і надзеяцца толькі на самых сябе, бо ніхто нікому нічога даць ня хоча, а хутчэй хацеўбы што ўзяць. Дык сапраўды нам трэба толькі арганізавацца і самым на сябе спадзявацца. Я н к а Т у т э й ш ы.

Адміністрацыйны Адезел Віленокай Дырэкціі Пошт і Тэлеграфаў, пісьмом з дня 27.І. с. г. № 15 Р.П., просіць нас зьмясьціць наступнае спраставаньне:

„Адміністрацыйным сьледствам сьцьверджана, што карэспандэнцыя замясцовая даручаецца адрасантам праз Урад Гміны. Кіраўнік пошты Язно ніякай гутаркі ў справе чытаньня беларускіх газэт з жыхарамі вёскі Фурсы, Дзісненскага пав. ня меў, а гэтым самым ня мог гаварыць, што ня можна атрымліваць і чытаць „Бел. Крыніцы“.

Танная прадажа беларускіх кніг.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ «ПАГОНЯ»

(Вільня, Людвісарская № 1)

прадаўжае танную прадажу беларускіх кніг, якіх сьпіс кнігарня высылае, хто пришле на гэта марку на 10 гр.

Кнігарня на кожнай з празначаных для таннай прадажы кніг робе значную ўступку, а на некаторых уступае палавіну (50 проц.) Танная прадажа ўжо пачалася і будзе трываць да 20. II. 1930 г. Грамадзяне, пасьпяшыце скарыстаць з гэтай рэдкай аказіі.

Увага: Кніжкі высылаюцца поштай па атрыманьні ўсей вартасьці заказу, або накладной платай (za pobraniem) па атрыманьні аднэй трэцяй часткі вартасьці заказу.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Дрк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч.